Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

31 ЛІПЕНЯ 2008 г.
ЧАЦВЕР
№ 141
(26254)

Кошт 450 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Пісьмо ў нумар

АЎТОБУС ПРАЗ ВЁСКУ ІДЗЕ. АЛЕ... НЕ СПЫНЯЕЦЦА

Не вам казаць, вясковыя жыхары ў сацыяльным плане пазбаўлены многага...

Праз нашу вёску Абчак, напрыклад, праходзіць гарадскі аўтобус № 112. На маршруце «Мінск — Сокал» вадзіцелі па просьбе спыняліся. Цяпер гэта катэгарычна забаранілі. Атрымліваецца, што ў горад на працу, у школу, дзіцячы садок і г.д. на гарадскім транспарце мы выехаць можам, а вось вярнуцца назад на ім — не. Нас вымушаюць карыстацца альбо прыгарадным транспартам, што вельмі нязручна і амаль у два разы даражэй, альбо ехаць аўтобусам № 112 да прыпынку «Заямачнае», там пераходзіць трасу і вяртацца на зваротным рэйсе.

Крыўдна, тым больш, што большасць з нас працуе ў Мінску, адпаведна падаходны падатак, які мы плацім, залічваецца ў бюджэт горада, і ў выніку гарадская інфраструктура развіваецца ў тым ліку і за наш кошт. А вось як нам карыстацца гарадскім аўтобусам, то, як кажуць, прабачце.

Звароты ў розныя інстанцыі, а таксама да нашага дэпутата станоўчага выніку не далі, бо маршрут аўтобуса гарадскі, а мы — вёска і да горада дачынення не маем. Хоць прыпынкі «Трасцянец» і «Заямачнае» таксама да горада не адносяцца.

Просьбу зрабіць прыпынак «па патрабаванні» ў Абчаку адхіліла ДАІ, матывуючы тым, што траса хуткасная, але ж прыпынак «Заямачнае» знаходзіцца на той жа трасе і існуе ўжо некалькі гадоў. Узнікае ўражанне, што інтарэсы жыхароў нашай асобна ўзятай вёскі нікога не хвалююць. Але гэта ж нонсенс — аўтобус праз Абчак ідзе, але ў ім не спыняецца!

Атрымліваецца, што вясковец, не маючы па месцы жыхарства працы, садка, школы, аптэкі, вымушаны ездзіць у горад, вазіць туды дзяцей, ды яшчэ і церпяць нязручнасці. Ніякай логікі.

З павагай, жыхары вёскі Абчак НІКАНАВА, БУЛОЙЧЫК, СЛІНЬКОВА, ПАНКРАТОВІЧ і іншыя. Усяго 70 подпісаў.

Нататкі звычайнага грамадзяніна

ХАЧУ ЖЫЦЬ З НАЧАЛЬНІКАМ ЖКГ І...

Трохпавярховы дом № 8, што на вуліцы Гагарына ў Віцебску, цяжка назваць жылым. Няма гарачай вады, цякуць каналізацыйныя трубы, кухні агульныя... Затое слізнякі і іншыя «гады» ў адрозненне ад людзей адчуваюць у доме сябе вельмі вольна.

На жаль, у віцебскі карпункт «Звязды» жыхары не звярталіся са сваімі праблемамі. А трэба было б! У такіх выпадках заўсёды стараюся неяк падказаць, дапамагчы артыкулам. Дом № 8 бачны з вокнаў «карпункта». Двукоссе пастаўлена нездарма. Справа ў тым, што той самы карпункт знаходзіцца ў звычайнай «хрушчоўцы» — з прахаднымі пакоямі. Раней тут таксама не было гарачага водазабеспячэння і іншых тыповых для старога дома праблем хапала. Здзівіла, дарэчы, публікацыя ў адной мясцовай газеце. Паважаная мной калега (цяпер яшчэ болей паважаная) чамусьці, расказваючы аб праблемах дома № 8, сярод іншага адзначыла, што «ў другім, на шчасце, пасяліўся карэспандэнт адной з рэспубліканскіх газет...» Далей акуратна гаворыцца, што «ён» (уласны карэспандэнт) шмат чаго дабіўся, каб быў адрамантаваны дом і добраўпарадкаваны.

Шчыра? Пасяліўся я ў доме № 17 у 1990-м. А капітальны рамонт, калі не памыляюся, пачалі рабіць толькі ў 2002-м (так супала, што тады я сапраўды перайшоў на працу ў рэспубліканскую газету). Абяцалі, што менш за год рамонт будзе доўжыцца. А насамрэч атрымалася — каля трох гадоў. І як гэта ўсё вытрымалі жыхары? І падчас «доўгарамонту» скардзіліся. А што зробіш, калі ў родную прыбіральню, з-за таго, што трубы мянялі больш за тыдзень, увайсці нельга было? Раўзнэне аб прыняцці дома на капрамонт «доўга абмяркоўвалася» ў гаршыканкаме. Гадамі людзі чакалі станоўчага рашэння. І ўвесь гэты час я працаваў у розных месцах, а апошнія доўгія гады — у недзяржаўнай газеце.

Жыхары нашага дома — людзі розныя, як і ў іншых. Адным усё роўна дзе жыць — у якіх умовах. Другім — не. Актывісты і да пачатку рамонту пісалі лісты, хадзілі на прыёмы да чыноўнікаў. Адпраўлялі калектыўныя скаргі. Добра памятаю, калі пра рамонт толькі марылі, кожны раз прыходзілі адказы — «грошай няма, ваш дом у плане на рамонт будзе пастаўлены...» І тэрміны рамонту неаднаразова пераносіліся. Дакладна — калі жыхары прыйшлі калектывам на асабісты прыём да былога старшыні гарвыканкама, той, улічваючы, што абяцалі рамонт гадамі і інш., «даў каманду».

Так што, прабачце, карэспандэнт тут не пры справах. Шчыра шкада жыхароў дома № 8. Не ведаю, ці скардзіліся яны пісьмова ў розныя інстанцыі. І не толькі віцебскія. Няўжо толькі ў мясцовую газету? Больш за ўсё, дарэчы, здзіўляюць дэпутаты розных узроўняў, якім жыхары аддалі свае галасы на выбарах. Няўжо не галасавалі? А выбраныя не ў курсе праблем? Не веру! Здзіўляе і пазіцыя гарвыканкама. Наколькі я ведаю, ніколі сур'ёзна не абмяркоўвалася пытанне, як агульна і канкрэтна вырашыць праблему актывізацыі рамонту старых жылых дамоў. Памятаю, былы старшыня райвыканкама скардзіўся, што, каб адрамантаваць усе, дзесяткі гадоў трэба і бюджэту ўсяго раёна таксама спатрэбіцца. Выйсце? Ніякага. Больш за тое, як высвятлялі спецыялісты Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці, сродкі, што выдзялялі на капітальны рамонт дамоў, выкарыстоўваліся неэфектыўна.

Я пісаў ужо і зноў паўтару. Ведаю, у якіх дамах жывуць мясцовыя начальнікі. Планіроўка... Не «хрушчоўка», адным словам. І слізнякі «ў дэфіцыце». Мяне на паляпшэнне жыллёвых умоў у чаргу не паставілі з двума лішнімі метрамі. Жывеш тут і працуеш? На здароўе! Памятаеце прафесара з «Сабачага сэрца», які не хацеў рэзаць жывёл там, дзе прымае ванну? І я не хачу. А што зробіш?

Няўжо тыя ж кіраўнікі, што не «могуць» дапамагчы жыхарам дома № 8, жывуць у такіх жа старых дамах? Адзін вясёлы віцебскі грамадзянін пажартаваў — усе дамы адрамантуюць, калі ў кожным па чарзе будуць жыць начальнікі — ад ЖКГ да выканкама і іншыя! І па начах кампаніі п'яныя не будуць пад вокнамі збірацца, калі начальнік РАУС будзе сярод жыхароў. Адказных асобаў у нас хапае. Мо — гэта і ёсць выйсце? Хоць, вядома ж, бюджэт Віцебска — «не гумавы».

Жыхарам дома № 8 (дарэчы, былога інтэрната будаўнічай арганізацыі) хочацца параіць быць больш актыўнымі. Пісаць трэба, хадзіць. Але не тэлефанаваць, бо толькі час патраціце. А нам, радавым журналістам, думаецца, не трэба баяцца крытыкаваць абыякавых чыноўнікаў усіх узроўняў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Краіна здароўя

Доступ да высокіх тэхналогій

Сёлета колькасць нованароджаных павялічылася на 2,3 працэнта, а памерлых знізілася на 1,1 працэнта. Адметна, што немаўлят актыўна «дадаюць» гарады, у той час як у сельскай мясцовасці такога пазітыву не назіраецца. Такія даныя атрыманы пасля падвядзення вынікаў работы сістэмы аховы здароўя за першае паўгоддзе.

Як адзначаюць у прэс-службе Міністэрства аховы здароўя, цяпер у краіне назіраецца пэўнае зніжэнне колькасці памерлых ад хваробаў сістэмы кровазвароту, новаўтварэнняў, ад знешніх прычын, хваробаў мочапалавой і стрававальнай сістэм. Істотна знізілася колькасць памерлых ад хваробаў органаў дыхання і туберкулёзу — на 20,5 працэнта. Нягледзячы на некаторыя іншыя пазітыўныя моманты, пераадолець дэмаграфічны крызіс пакуль не ўдаецца. Натуральны прырост застаецца адмоўным ва ўсіх рэгіёнах, акрамя сталіцы. У шэрагу раёнаў адзначаны рост смяротнасці насельніцтва, а таксама высокія паказчыкі дзіцячай смяротнасці.

У першым паўгоддзі 2008 года значна выраслі аб'ёмы і пашырыўся спектр высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі. Так, колькасць кардыяхірургічных аперацый склала 2,7 тысячы, у адпаведны ж перыяд мінулага года было 1,3 тысячы. Дарэчы, цяпер ва ўсіх абласных цэнтрах выконваюцца дыягнастычныя каранарографіі, аперацыі па імплантацыі электракардыястымулятараў, стэнтаванню артэрый. У чэрвені такія ўмяшанні пачалі выконвацца ў Мінскай вобласці. Аортакаранарнае шунціраванне выконваецца не толькі ў РНПЦ «Кардыялогія», але і ў Гомельскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцях.

Сёлета праведзены чатыры аперацыі па трансплантацыі печані, 47 аперацый па трансплантацыі ныркі, 1285 — па эндапратэзаванні тазасцегнавога сустава і 185 — па эндапратэзаванні сустава каленнага.

Крыху больш за палову дарослых беларусаў «прайшлі» дыспансэрызацыю — медыцынскія агляды, падчас якіх амаль у 35 працэнтаў былі выяўлены сацыяльна значныя захворванні. З 4,3 млн у 1,7 млн агледжаных захворванні выяўлены ўпершыню. Сёлета прадугледжаны ўвод 257 аб'ектаў аховы здароўя ў сельскіх населеных пунктах, якія пераўтвараюцца ў аграгарадкі. Ужо ўведзена ў эксплуатацыю 110 аб'ектаў.

Святлана БАРЫСЕНКА.



Мінскі парк Чалюскінцаў.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Сёлета інфляцыя можа скласці каля 14 працэнтаў

Аб гэтым учора на прэс-канферэнцыі паведаміла намеснік міністра эканомікі Таццяна Старчанка. Намеснік міністра нагадала, што за першае паўгоддзе інфляцыя ў Беларусі склала 7,3 працэнта. Цяпер перад эканамістамі краіны пастаўлена задача захаваць узровень гэтага паказчыка і ў другім паўгоддзі, у выніку, інфляцыя за год складзе каля 14 працэнтаў. Павелічэнне ўзроўню інфляцыі звязана галоўным чынам са знешнімі фактарамі, падаражаннем харчавання, энерганосьбітаў і іншай сыравіны на сусветных рынках. Разам з тым у комплексе антыінфляцыйных мераў будзе заставацца дзяржаўнае рэгуляванне цэнаў на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі і сацыяльна значных тавараў.

Таццяна Старчанка адзначыла, што асноўныя вынікі народнай гаспадаркі сведчаць аб станоўчай дынаміцы развіцця эканомікі краіны. Так, да 6 месяцаў года было ўведзена ў эксплуатацыю 2 мільёны 722,6 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылых дамоў, што складае 52,4 працэнта ад запланаванага задання на год. У параўнанні з першым паўгоддзем мінулага года тэмпы будаўніцтва жылля павялічыліся сёлета на 15,2 працэнта. У вёсках і малых гарадах за гэты час было пабудавана 1 мільён 88,7 тысячы квадратных метраў жылля, што на 6 працэнтаў больш, чым за мінулагодні перыяд. Асноўнымі крыніцамі фінансавання жыллёвага будаўніцтва ў краіне застаюцца ўласныя сродкі насельніцтва і крэдыты банкаў, за якія было пабудавана адпаведна 48,6 і 41,6 працэнта жылля.

Т. Старчанка ўпэўнена, што дзякуючы актыўнай дзяржаўнай палітыцы па стварэнні новых працоўных месцаў у малых гарадах, сёлета адзначаецца тэндэнцыя па зніжэнні ўзроўню беспрацоўя ў гэтых населеных пунктах. Зараз у малых гарадах Брэсцкай і Віцебскай абласцях узровень беспрацоўя складае адпаведна 1,7 і 1,3 працэнта, што прыкладна на 0,2 пункта ніжэй за прагнозныя паказчыкі.

Спецыяліст Мінэканомікі паведаміла, што сёння ва Ўрадзе Беларусі рыхтуецца праект прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2009 год, дзе будзе прадугледжвацца магчымае падаражанне расійскага газу. У праекце разглядаюцца розныя варыянты развіцця падзей. Разам з тым укараненне новых тэхналогій і сучасных вытворчасцяў дазволяць краіне ў наступным годзе пазбегнуць крытычнай сітуацыі ў эканоміцы, удакладніла Таццяна Старчанка.

Сяргей КУРКАЧ.

«ТУРКСЕЛ» НАБЫВАЕ 80 ПРАЦЭНТАЎ АКЦЫЙ ЗАТ «БЕСТ»

У аўторак у Мінску быў падпісаны дагавор куплі-продажу 80 працэнтаў акцый ЗАТ «БеСТ» паміж Дзяржаўным камітэтам па маёмасці Беларусі ў якасці прадаўца, «Белтэл Тэлекамунікасьён Хізметлеры А.Ш.» у якасці пакупніка і «Турксел Ілецішым Хізметлеры А.Ш.» у якасці гаранта.

Аплата турэцкай кампаніяй згаданай долі акцый, якая будзе набыта за 500 мільёнаў долараў ЗША, як мяркуецца, пройдзе ў тры этапы. Спачатку будзе аплачана 300 мільёнаў долараў на дату завяршэння здзелкі, якая наступіць пасля 30 дзён з даты падпісання пагаднення. А дадатковыя плацяжы па 100 мільёнаў будуць зроблены 31 снежня адпаведна 2009-га і 2010 гадоў. Акрамя таго, яшчэ адзін плацеж у памеры 100 мільёнаў долараў будзе зроблены пасля атрымання кампаніяй «БеСТ» станоўчага гадавога даходу. Такім чынам, беларускі бок у сукупнасці за 80 працэнтаў акцый атрымае 600 мільёнаў долараў.

Ігар ГРЫШЫН.

ТРАГЕДЫЯ НА ПЕРАЕЗДЗЕ

Старшыня СВК «Цельшына» Ганцавіцкага раёна разам з галоўным бухгалтарам і маладым спецыялістам — дачкой бухгалтара паехаў у райцэнтр па грошы. Калі яны вярталіся назад, то на пераездзе трапілі пад маневровы лакаматыў.

Галоўны бухгалтар з дачкой загінулі на месцы, а старшыня сельгаскааператыва ў цяжкім стане знаходзіцца ў рэанімацыі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

На слуху

Працуеш? Зважай на... суседа

У Беларусі вызначаны правілы ўнутранага распарадку садаводчых таварыстваў. Прычым, як паведаміла карэспандэнту «Звязды» кансультант юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства эканомікі Антаніна Бадзілоўская, гэтыя правілы пачнуць дзейнічаць зусім хутка — з 7 жніўня.

ПАД'ЕЗД БЕЗ ПЕРАШКОД

Меры проціпажарнай бяспекі не былі лішнімі ніколі, а тым больш — у садаводчых таварыствах. Таму трэба ведаць: да кожнага ўчастка павінен быць забяспечаны свабодны пад'езд спецыяльнага транспарту. Таварыства мусіць мець пажарныя вадаёмы ёмістасцю не менш за 25 кубічных метраў. А каля кожнага дома ўлетку неабходна паставіць ёмістасць з вадой аб'ёмам не менш за 0,2 кубаметра.

Апроч таго, таварыствы павінны мець перасоўныя мотапомпы, прадугледзіць на воданапорных вежах і ў сістэмах водаправоду праз кожныя 120 метраў прыстасаванні для забору вады, устанавіць спецыяльныя шчыты з наборам з двух сякер, ломаў, рыдлёвак, жалезных багроў, вёдраў, вогнетушыцеляў, аднаго проціпажарнага палотнішча і адной скрыні з пяском — адзін такі шчыт прадугледжваецца з разліку на кожныя 20 участкаў.

— На ўчастках катэгарычна забараняецца пакідаць без нагляду распаленыя вогнішчы, гаручыя і самаўзгаральныя рэчывы, — падкрэслівае Антаніна Бадзілоўская. — І, зразумела, што ў мэтах бяспекі тут нельга выпальваць сухую траву ці рэшткі іншых раслін.

СМЕЦЦЕ — ТОЛЬКІ Ў КАНТЭЙНЕР

Праблема смецця знаёмая ці не кожнаму садаводу. Таму варта заўважыць: новыя правілы прымусяць усе таварыствы заключыць дагаворы на выдаленне адходаў з юрыдычнымі асобамі ці прадпрымальнікамі. Для збору адходаў павінны быць усталяваныя кантэйнеры — ёмістасцю 0,75 кубаметра на 30 і менш участкаў. Пры гэтым адлегласць ад такога кантэйнера да вокнаў садовага доміка не можа быць меншай за 20 метраў.

— Трэба падкрэсліць, што на тэрыторыі агульнага карыстання таварыства нельга мыць аўтамабілі і іншыя транспартныя сродкі, — адзначае Антаніна Бадзілоўская. — Гэтаксама як нельга і закопваць смецце ў зямлю, выкідваць яго ў бліжэйшы лес, зліваць вадкія камунальныя адходы.

РАНКАМ НІХТО НЕ БУДУЕ

Не менш балючая тэма — шум. Вось чаму тут трэба заўважыць: уведзеныя абмежаванні па шуму пры карыстанні магнітафонамі, тэлевізарамі, радыёпрыёмнікамі і іншай «гукавой» бытавой тэхнікай у залежнасці ад часу сутак — з 7 да 23 і з 23 да 7 гадзін. Апроч таго, з'явіўся своеасаблівы мараторый на «шумныя» будаўнічыя работы ноччу, ранкам і вечарам — гэтыя работы дазваляецца весці толькі з 9 да 19 гадзін.

КАРОВА КАЧЦЫ НЕ ТАВАРЫШ

Не сакрэт, што некаторыя члены садаводчых таварыстваў ператварылі свае ўчасткі ў своеасаблівыя міні-фермы. Гэтага, заўважае Антаніна Бадзілоўская, быць не павінна. У прыватнасці, правілы забараняюць утрымліваць у таварыствах буйных жывёл, скажам, казу, авечку, свінню, карову ці каня. А вось што да курэй, качак, індыкоў, пчол, трусоў і іншых дробных жывёл, то трымаць іх можна. Аднак трэба памятаць: адлегласць ад асобнага доміка да мяжы сумежнага ўчастка павінна быць не менш за 3 метры, а адлегласць ад гаспадарчай пабудовы да мяжы з суседам — не менш за метр. Прычым адлегласць паміж садовымі домікамі на сумежных участках мусіць складаць не менш за 6 метраў. Асобна варта спыніцца на пабудовах без гідраізаляцыі фундамента для ўтрымання дробнай жывёлы — такія пабудовы неабходна размяшчаць на адлегласці не менш за 15 метраў ад садовых домікаў і на адлегласці не менш за 20 метраў ад калодзежаў.

ЛІЧЫ МЕТРЫ

Нарэшце, колькі слоў аб садовых доміках і гаспадарчых пабудовах. Узводзіць іх можна. Аднак трэба памятаць: адлегласць ад асобнага доміка да мяжы сумежнага ўчастка павінна быць не менш за 3 метры, а адлегласць ад гаспадарчай пабудовы да мяжы з суседам — не менш за метр. Прычым адлегласць паміж садовымі домікамі на сумежных участках мусіць складаць не менш за 6 метраў. Асобна варта спыніцца на пабудовах без гідраізаляцыі фундамента для ўтрымання дробнай жывёлы — такія пабудовы неабходна размяшчаць на адлегласці не менш за 15 метраў ад садовых домікаў і на адлегласці не менш за 20 метраў ад калодзежаў.

І яшчэ. Правілы прадугледжваюць, што яблыні і грушы трэба высаджваць на адлегласці не менш за 3, слівы, вішні, дэкаратыўныя і карлікавыя дрэвы — не менш за 2, а кусты — не менш чым за метр ад мяжы з суседнім участкам.

Дарэчы, заўважыла Антаніна Бадзілоўская, за парушэнне новых правілаў вызначана адказнасць. У горшым выпадку парушальніка могуць выключыць з членаў садаводчага таварыства.

Сяргей ГРЫБ.

НЯШЧАСЦЕ НА БУДОЎЛІ

У Мінску на будоўлі дома па Лагойскім тракце ўпаў з вышыні 50-гадовы сталічны жыхар.

Як удакладнілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, няшчасны выпадак адбыўся а палове дзевятай раніцы: муляр упаў з дзевятага паверха і ад атрыманых цялесных пашкоджанняў загінуў на месцы здарэння. Паводле папярэдніх звестак, прычынай здарэння стала парушэнне тэхнікі бяспекі.

Ігар ГРЫШЫН.

КІРОЎЦА НАЕХАЎ НА ВЕЛАСІПЕДЫСТАК

У Лельчыцкім раёне пад колы мікрааўтобуса «Форд» трапілі дзве няпоўнагадовыя сястры, якія ехалі на веласіпедзе.

Дарожна-транспартнае здарэнне зафіксавана на дарозе паблізу вёскі Глушковічы. 28-гадовы непрацуючы мясцовы жыхар, які кіраваў мікрааўтобусам, учыніў наезд на дзяўчатак 1998 і 1994 гадоў нараджэння з Лельчыцаў. У выніку ДТЗ старэйшая сястра загінула, а малодшая з цялесным пашкоджаннямі змешчана ў бальніцу.

Ігар ГРЫШЫН.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ПОЛЬШЧЫ АДКРЫВАЮЦЬ ПЕРШЫ «БЭБІ-ЦУМ»

У Польшчы разгарэліся спрэчкі з нагоды прызначанага на наступны тыдзень адкрыцця першага ў краіне цэнтра сурагатных маці. Каталіцкая царква выступае катэгарычна супраць гэтай ініцыятывы, аднак многія грамадзяне краіны яе падтрымліваюць.

Ужо выпушчаны прэйскурант на «матчыны паслугі», у цэнтра з'явіліся першыя заказчыкі. Таксама ў цэнтр ужо звярнуліся 37 жанчын, якія прапанавалі свае здаровыя арганізмы для таго, каб ашчаслівіць тых, хто самастойна не можа стаць бацькамі. У прэйскуранце цэнтра сурагатных маці паказана, што кошт выношвання дзіцяці будзе вагацца ад 30 да 45 тысяч злотых (15—22,5 тысячы долараў). Паводле таго ж прэйскуранта, кошт за шчасце быць бацькамі не з'яўляецца цвёрда рэгламентаваным і «торг магчымы».

НЯМЕЦКІЯ ХІРУРГІ ПЕРАСАДЗІЛІ АБЕДЗВЕ РУКІ

Каманда нямецкіх хірургаў правяла першую ў краіне аперацыю па двайной перасадцы донарскіх рук 54-гадоваму пацыенту, перадае Telegraph. У аперацыі, якая доўжылася больш за 16 гадзін, бралі ўдзел пяць груп урачоў агульнай колькасцю 30 чалавек.

Пацыент нямецкіх лекараў пазбавіўся рук шмат гадоў таму, у выніку няшчаснага выпадку на сельскагаспадарчых работах. Донарам рук стаў 19-гадовы малады чалавек, які загінуў у аўтакатастрофе. Аперацыя, падрыхтоўка да якой заняла каля пяці гадоў, адбылася ў пятніцу ў мюнхенскай клініцы Ісар.

Як растлумачыў хірург, які кіраваў аперацыяй, хвораму прадстаіць доўгі курс аднаўленчай фізіятэрапіі. У прыватнасці, па прагнозе спецыяліста, адчуць пальцы ізноў здабытых рук ён зможа прыблізна праз два гады.

ПУЦІНА І МЯДЗВЕДЗЕВА «ЎВЕКАВЕЧЫЛІ» Ў СТРАЗАХ SWAROVSKI

Партрэты абодвух прэзідэнтаў — новага і былога — сталі прыбытковым бізнэсам для гандляроў канцылярскімі таварамі. Яшчэ ўвесну партрэты Пуціна лідзіравалі. Аднак, Мядзведзеў усё больш выцясняе свайго папярэдніка «з рынку». У некаторых крамах з'явіліся нават малюнкі кіраўніка дзяржавы, выкладзеныя з крышталяў Swarovski па кошце ад 12 тысяч расійскіх рублёў.

«Партрэт прэзідэнта стане годным упрыгожваннем любога інтэр'еру: надасць значнасць офісу, падкрэсліць патрыятычны дух уладальніка і яго гатоўнасць з поўнай аддачай займацца любімай справай на дабрабыт сваёй сям'і і краіны», — абвяшчае рэкламны тэкст адной з крамаў. Тым, хто не можа без Пуціна, прапаноўваюць кампраміс: сумесныя партрэты прэзідэнта і прэм'ера.



ЖНІВО — СПРАВА СЯМЕЙНАЯ

На ўборцы ўраджаю ў СВК «Калгас «Святло кастрычніка» настрой задаюць экіпажы сваякоў, якія прадстаўляюць сельскія працоўныя дынастыі.

На мехдвары ў вёсцы Благавічы Чавускага раёна ажыўлена з 7-й раніцы. Камбайнеры наладжваюць машыны, запраўляюцца і адпраўляюцца на палі гаспадаркі.

Сярод мужчын вылучаецца жвавая дзяўчына ў руковай кашулі. З жалеззем у руках яна круціцца вакол «Дона» і зусім не выглядае госцяй у мужчынскай кампаніі.

Дзяўчыну завуць Дыянай. Разам са сваім бацькам Анатолем Давыдавічам Рыжковым 20-гадовая студэнтка Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі працуе на ўборцы ўраджаю.

— Я ўжо закончыла трэці курс, так што ў сельскай тэхніцы разбіраюся няблага, — з усмешкай запэўнівае Дыяна. — На канікулах можна папрацаваць і зарабіць грошы.

Сёлетняя ўборачная кампанія — ужо 7-я для Дыяны: з 14 гадоў яна працуе з бацькам памочніцай камбайнера. Гэту пасаду дзяўчына атрымала ў спадчыну ад сваёй старэйшай сястры, якая выйшла замуж і цяпер занятая іншымі клопатамі.

Анатоль Давыдавіч палічыў, што сёлетняе жніво — для яго аж 26-е! З Дыянай яму працуецца добра: вясёлая дзяўчына падтрымлівае настрой песнямі ды жартамі, а ён заўсёды гатовы дапамагчы і навучыць.

Тры тыдні бацька і дачка разам працуюць ад золку да захаду і плануюць, што гэта ўборачная кампанія прынясе ў сямейны бюджэт Рыжковых не меней за некалькі мільёнаў рублёў. Прычым сваю частку Дыяна мяркуе выдаткаваць на аплату навучання і атрыманне вадзіцельскіх правоў, каб нарэшце мець магчымасць кіраваць не толькі бацькавым камбайнам, але і аўтамабілем.

У гаспадарцы «Святло кастрычніка» на ўборцы працуе шмат сямейных экіпажаў. Напрыклад, Сцяпанавы: у помочніках старшага камбайнера Аляксандра Міхайлавіча — сын, які служыць у міліцыі і вось ужо каторы год запар бавіць адпачынак на жніве. Прычым сам бацька — загадчык фермы, які на час свайго камбайнёрства пакідае прыглядаць за жывёлай сваю жонку.

У іншым экіпажы — наадварот: старшы камбайнер Яўген Катэрна ўзяў сваім памочнікам бацьку Віктара Мікалаевіча. Ён — пенсіянер, але чалавек актыўны і дома склаўшы рукі сядзець не хоча.

У яшчэ адно звяно аб'ядналіся сваякі: Сяргей Хорак — старшы камбайнер, адвозіць збожжа яго брат Міхаіл, а памочнікам працуе 27-гадовы сын Міхаіла Аляксандр. У Аляксандра Хорака, супрацоўніка МНС, цяпер чарговы водпуск, які ён напоўніў працоўным зместам.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

У старшага камбайнера Анатоля Давыдавіча РЫЖКОВА памочніцай працуе 20-гадовая дачка Дыяна. Гэта іх 7-е сумеснае жніво.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08141

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.07.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 114,00
1 еўра	3 297,95
1 латвійскі лат	4 684,76
1 літоўскі літ	955,16
1 чэшская крона	138,82
1 польскі злоты	1026,34
1 расійскі рубель	90,17
1 украінская грыўня	454,06

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	23,4456
10 UAH	50,3124
1000 BYR	11,0802
EUR	36,5329

Курс у гандлёвых кампаніях (на 30.07.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Жніво — справа сямейная

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Нашы сямейныя экіпажы склаліся з даўніх часоў,— тлумачыць кіраўнік СВК «Калгас «Святло кастрычніка» Рыгор Шарко. — Гэта ўсё прадстаўнікі моцных працоўных дынастый, якія свае ўменні атрымліваюць у спадчыну ад старэйшых. Вось Міхаіл Хорак — вопытны работнік, усё жыццё працуе сумленна і талкова. І яго сын, які прыйшоў на падтрымку ў час жніва, не адстае ад бацькі. І мне з імі прасцей працаваць, таму што сямейныя экіпажы ўмеюць працаваць на вынік, на іх можна паспадзявацца і шмат чаму навучыцца ў іх.

Рыгор Паўлавіч кіруе «Святлом кастрычніка» трэці год. Сёлета ўборачная ў калгасе напружаная: да СВК далучылі суседнюю гаспадарку. Павялічыліся пасяўныя плошчы і адлегласці, але першае аб'яднанае жніво тут спадзяюцца правесці паспяхова.

— Мы ўбралі рапс, і толькі трэцяга дня прыступілі да ўборкі збожжавых, — расказвае старшыня. — Увогуле мы разлічваем намалаціць 6 тысяч тон збожжа, што дасць нашай гаспадарцы адчуваць сябе ўпэўнена. З палівам праблем няма, з рамонтам тэхнікі спраўляемся, вось толькі б надвор'е не падкачала.

Замовіць слова перад нябеснай канцылярыяй прасілі настаяцеля Благавіцкай праваслаўнай царквы айца Міхаіла. У аўторак ён адслужыў малебен у падтрымку вяскоўцаў, якія працуюць на жніве. А народны ансамбль «Расцяначка» Дома культуры ў Гарбавічах правёў абрад Зажынак прама на полі.

— Безумоўна, жніво — гэта наша звыклая сялянская праца, але яна патрабуе напружання, дысцыпліны, — сказаў Рыгор Шарко. — Нашы людзі і самі адчуваюць, што ўборачная кампанія — вялікая адказнасць, і працуюць належна. Я ўсім вяскоўцам пажадаў быць цярплівасці, стараннасці, добрага заробку і веры ў лепшую будучыню.

Ілона ІВАНОВА. *Чавускі раён.*



На полі кіраўнік гаспадаркі «Святло кастрычніка» Рыгор ШАРКО з сямейным экіпажам Сцяпанавых (бацька — загадчык фермы, сын — міліцыянер у чарговым водпуску).

P.S. *— Да ўборкі ўраджаю прыступілі ўсе гаспадаркі раёна, — пракаментаваў* ***старшыня Чавускага райвыканкама Анатоль МАЦЮЛІН.*** *— На гэтым тыдні наш раён атрымае 6 новых камбайнаў, а гэта дадатковы стымул. У нашых лепшых гаспадарках ужо намалацілі больш чым па 1000 тон, пры ўраджайнасці за 40 цэнтнераў з гектара. Хлеб стаіць, і людзі імкнуцца яго сабраць. Камбайнеры спыняцца не хочуць лішні раз, а некаторых а 12-й ночы не выгнаць з поля. Так што напружанне ў нас высокае. Толькі б было надвор'е і не ламалася тэхніка!*

Увогуле ў Магілёўскай вобласці, паводле інфармацыі на 30 ліпеня, убрана больш за 36 тысяч гектараў — а гэта больш за 11 працэнтаў ад пасяўных плошчаў. Намалочана каля 130 тысяч тон. Ураджайнасць складае 34,7 цэнтнера з гектара, а гэта лепшы паказчык у параўнанні з леташнім. Рэкардсмен па ўраджайнасці на Магілёўшчыне — Шклоўскі раён (49 ц/га).

Паўнацэннае збожжа — нават з палеглых участкаў

Гаспадаркі Гродзеншчыны фарміравалі максімальнае атрыманне ўраджаю, але стыхія прадыктавала свае ўмовы. На плошчы каля 90 тысяч гектараў, а гэта прыкладна чвэрць пасеваў, збожжавыя былі нахіленыя да зямлі, прычым ёсць і ўчасткі суцэльнай палеглі. А ў некаторых месцах стыхія сама правяла «малацьбу» сельгаскультур, пакінуўшы аголеныя сцябло, практычна без зерня.

— Тым не менш усё будзе ўбрана. Палегліца ў большай ці меншай ступені была і дваццаць, і трыццаць гадоў таму. Ды і ўвогуле праблемы заўсёды былі і будуць. Вось і цяпер робіцца ўсё, каб іх вырашыць, — адзначае намеснік начальніка аддзела раслінаводства Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гродзенскага аблвыканкама Рыгор Радзевіч.

Менавіта працы на палеглых участках, каб узяць адтуль максімальны ўраджай, і надаецца на пачатку жніва першачарговая ўвага. І нават там, хоць пэўныя страты і непазбежныя, у шэрагу гаспадарак атрымліваюць паўнацэннае збожжа. Як, да прыкладу, у СВК «Прагрэс-Верцялішкі» Гродзенскага раёна, дзе з такіх участкаў намалочваюць не менш за 60 цэнтнераў з гектара. Увогуле ж, на раніцу 30 ліпеня, сярэдняя ўраджайнасць у вобласці складае 44,7 цэнтнера з гектара. А ў Гродзенскім раёне — 62,1, у Мастоўскім — 57,5, у Бераставіцкім — 55,2 цэнтнера з гектара.

Уборка палеглых участкаў, безумоўна, стварае праблемы з манеўраваннем тэхнікі і, адпаведна, тэмпамі жніва. Тым не менш штодзённа збожжавыя скошваюцца з чатырох працэнтаў уборачнай плошчы. А калі палегліца будзе ўбрана, тэмпы жніва могуць павялічыцца. Вядома ж, пры адпаведных умовах надвор'я.

Як уплываюць на палеглiцу сельгаскультур іх гатункі, а таксама правільнае прымяненне ўгнаенняў? Умовай для няправільнага прымянення ўгнаенняў, адзначае Рыгор Радзевіч, проста не існуе. Устаноўлены квоты на водпуск угнаенняў з беларускіх прадпрыемстваў і лішкаў у гаспадарак няма. Што датычыцца гатункаў сельгаскультур, то ў вобласці прымяняюцца гатункі і айчыннай, і замежнай селекцыі. І менавіта вытворчым шляхам адбіраецца тое лепшае, што прабівае сабе дарогу на палях. Верагодна, пэўныя высновы будуць зроблены і з улікам сённяшніх прыродных катаклізмаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Чвэрць дыстанцыі

Спрыяльнае надвор'е апошніх дзён дало магчымасць гаспадаркам Брэстчыны поўнасцю раскруціць «махавік» жніва.

Ужо падцягнуліся ўсходняя раёны вобласці, і хоць адставанне ўсё ж адчуваецца, але яно не такое істотнае, як на пачатку ўборкі.

Вызначыліся і яўныя лідары: Брэсцкі, Жабінкаўскі і Камянецкі раёны — яны ўбралі трэць ад пасеянага. А найменш у Баранавіцкім — 9 працэнтаў.

Ураджай даволі высокі — у Брэсцкім раёне бяруць па 44,5 ц/га, у Камянецкім — пад 44 ц/га, а па вобласці — 37 цэнтнераў з гектара. Амаль на 10 цэнтнераў больш, чым летась.

Гаспадаркі стараюцца эфектыўна выкарыстоўваць тэхніку. Напрыклад, СВК «Жарабковічы» Ляхавіцкага раёна толькі прыступіў да жніва, але тэхніка сельгаскааператыва працуе ў іншых гаспадарках раёна, дзе збожжа паспела раней. Тры камбайны адпраўлены ў «Астрамечава» Брэсцкага раёна, бо там уборка ў самым разгары. За такое шэфства «Жарабковічы» будуць мець 10 працэнтаў ад намалочанага сваімі камбайнамі.

Людзі стараюцца максімальна выкарыстаць унутраныя рэзервы. У СВК «Агарэвічы» Ганцавіцкага раёна сапсаваўся рухавік на «Бізоне». За рамонт на заводзе ў Слоніме запатрабавалі 20 млн рублёў, але не давалі гарантыі, што ўсё будзе «ціп-топ», бо з запчасткамі да гэтага камбайна праблема.

Старэйшы механізатар гаспадаркі Аляксандр Аляксейчык прапанаваў паставіць на «Бізон» матор ад «Дона-1500». Разам са сваім напарнікам Анатолем Волахам ён узяўся за работу, і камбайн выйшаў у поле.

І на сёння на жніве ў некаторых раёнах працуюць амаль усе камбайны, хоць некалькі дзён таму іх на полі было менш за палову.

З продажам збожжа дзяржаве гаспадаркі не спяшаюцца. Іванаўскі раён не прадаў і кілограма, а вось Пінскі — 22 працэнты ад дзяржзаказу.

Рабіць высновы яшчэ ранавата. Карціна са жнівом стане больш-менш яснай, калі яно пераваліць свой экватар.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Адстаючых — на «прычэп»

Калі называюць лепшыя гаспадаркі Гомельшчыны, то абавязкова ў пералік іх трапляе СВК «Крыўск», што ў Буда-Кашалёўскім раёне. Калектыў яго працуе даволі ўстойліва, кожны год маючы прыбыткі. Летась, напрыклад, ён дасягнуў самага высокага ўраджаю сярод сельскагаспадарчых арганізацый вобласці, сабраўшы з кожнага гектара 69,5 так званага складскога цэнтнера збажыны. Агульны намалот — 5077 тон.

«Крыўск» дастойна выглядаў на леташнім рэспубліканскім фестывалі-кірмашы працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2007», што праходзіў у Рэчыцы. Яго кіраўнік Аляксандр Патарочын, галоўны аграном Васіль Ананьеў і галоўны інжынер Сяргей Баранаў атрымалі першыя прэміі.

Глебы тут далёка не самыя лепшыя: глееватыя, месцамі забалочаныя. Але, дзякуючы прымяненню зусім новай тэхналогіі яе апрацоўкі (так званая адвальна-безадвальна-рознаглыбінная сістэма), былі атрыманы важкія здабыткі. Дарэчы, па той сістэме меркаванні ў вучоных самыя розныя, але Патарочын упэўнены: гаспадарка — на правільным шляху.

Таму, відаць, сёлета згадзіўся на тое, каб да яго гаспадаркі былі далучаны два адстаючыя СВК, — «Бацунь» і «Івольск». Калі па выніках мінулага года «Крыўск» меў 638 мільёнаў прыбытку, дык «Бацунь» і «Івольск» — 6 і 119 мільёнаў страт адпаведна. Аб'яднаная гаспадарка амаль у два з паловай раза мае цяпер больш і сельгасугоддзяў, і ворыва, чым было раней у «Крыўску», і тут ёсць дзе развярнуцца як па зменах у сістэме севазвароту, так і па выкарыстанні тэхнікі і фінансавых сродкаў.

У абласным камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні нашаму карэспандэнту сказалі, што далучэнне адных прадпрыемстваў да другіх разглядаецца як поўны дадатковых рэзерваў іх эфектыўнай работы, у чым можна ўпэўніцца хоць бы на прыкладзе РСУП «Сож», які ўзначальвае Анатоль Татарынаў. У гэту гаспадарку ўліліся былы саўгас «Сацыялізм» і КСУП «Міжрэчча», і сёння дзякуючы шэрагу прынятых арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў там збіраюць па 31 цэнтнеру з гектара збожжавых, аб чым раней і не марылі.

— Каб належным чынам працавалі КСУП «Дземяхі» — Рэчыцкага, «Золак» і «Прудок» Светлагорскага раёнаў, — расказаў начальнік упраўлення інтэнсіфікацыі раслінаводства, яго перапрацоўчых галін і па праблемах чарнобыльскай катастрофы вышэйназванага камітэта Мікалай Вабішчэвіч — на базе Рэчыцкага камбіната хлебапрадуктаў і КСУПа «Савецкая Беларусь» створана акцыянерная таварыства. І яшчэ: сёлета таксама да перадавога КСУПа «Камінтэрн», што ў Буда-Кашалёўскім раёне, далучылі КСУПы «Чырвонакцябрскі» і «Дубавіцкі». Ёсць упэўненасць, што і там адбудуцца адпаведныя змены.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Падмурак прафесіі

ПАСТУПЛЕННЕ Ў ПТВ: БЕЗВЫХОДНАСЦЬ ЦІ АЛЬТЭРНАТЫВА?

Не проста альтэрнатыва, але і выдатная перспектыва — даказвалі кіраўнікі сталічных прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў і начальнік кіравання адукацыі камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Зоя Хахлова на наладжанай учора прэс-канферэнцыі.

Зараз у горадзе 26 устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі, з іх 10 прафесійна-тэхнічных каледжаў, 5 прафесійных ліцэяў, 11 прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, дзе атрымліваюць адукацыю больш за 17,5 тыс. выпускнікоў базавай і сярэдняй школы. Найбольшая колькасць такіх устаноў — будаўнічага профілю, карыстаецца папулярнасцю машынны профіль, існуюць таксама ўстановы гандлёвага, паліграфічнага і многіх іншых накірункаў.

Паводле прагнозаў развіцця сталічнага рынку працы, новыя працоўныя месцы будуць стварацца ў сферы паслуг, сувязі, фінансаў, у жыллёва-камунальнай гаспадарцы, грамадскім харчаванні, на транспарце. Павялічваецца прыём на будаўнічыя спецыяльнасці. Акрамя таго, сёлета ў індывідуальным парадку будуць падоўжаны тэрміны падачы дакументаў, каб у кожнага выпускніка было дастаткова часу на роздум і канчатковае вызначэнне са спецыяльнасцю. А выбіраць сапраўды ёсць з чаго: у цэлым у такіх установах рыхтуюцца спецыялісты па 164 кваліфікацыях.

У кінатэатры «Піянер» на працягу ўсяго года адбываюцца прэзентацыі прафесійна-тэхнічных устаноў.

Дзверы ПТВ на працягу ўсёй ступенькі кампаніі адчынены для ўсіх ахвотнікаў, але сёння набор на некаторыя спецыяльнасці ўжо спынены, што абумоўлена прэстыжнасцю і запатрабаванасцю прафесіі. Найбольшую цікавасць ва ўчарашніх школьнікаў выклікаюць спецыяльнасці «Банкаўская справа», «Паштовая сувязь», «Памочнік машыніста цеплавоза», «Майстар аддзелачных работ».

Навучэнцы ПТВ пры жаданні і паспяховасці могуць прадоўжыць навучанне на другой ступені, якая забяспечвае атрыманне сярэднеспецыяльнай адукацыі. Трэба зазначыць, што такая перспектыва падабаецца многім. Так, напрыклад, у сталічным будаўнічым каледжы імя Каменскага на 25 бюджэтных і 30 платных месцаў з'явілася 90 ахвотнікаў атрымаць кваліфікацыю тэхніка-будаўніка.

Дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця таксама маюць магчымасць атрымаць рабочую спецыяльнасць. Больш за тое, спектр прафесій для іх штогод павялічваецца. Так, з 1 верасня 2007 года адкрыты Цэнтр рэабілітацыі для асобаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа электронікі, дзе ажыццяўляецца падрыхтоўка для слабачуючых і глухіх дзяцей па спецыяльнасці «Аператар ЭВМ» з пераходам на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі па прафесіі «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій».

На ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы прафесійна-тэхнічных устаноў, згодна з Дзяржаўнай праграмай развіцця прафесійна-тэхнічнай адукацыі на 2006—2010 гады, сёлета выдзелена 5 млрд рублёў. «Сёння сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі становіцца цікавай для моладзі. У вучылішчах працуюць высокапрафесійныя кадры, уводзяцца інфармацыйныя тэхналогіі, а навучальныя класы маюць сучаснае абсталяванне», — зазначыла Зоя Хахлова.

Амаль 90 працэнтаў выпускнікоў сістэмы прафтэхадукацыі ўладкоўваюцца на працу па спецыяльнасці. Пацвярджаюць свой статус і прафесійныя ліцэі і каледжы: 70 працэнтаў выпускнікоў працягваюць адукацыю ў ССНУ і ВНУ.

Спецыяльна для выпускнікоў і іх бацькоў 6 жніўня адбудзецца «прамая лінія», якае дасць магчымасць усім ахвотнікам задаць свае пытанні кіраўнікам устаноў, патэлефанаваўшы па нумары 227 28 55.

Вольга ДАМАРАЦКАЯ.

Абзац

■ Доўгатэрміновая выстава «Ван Дэйк і яго эпоха» адчынілася ў Авальнай зале Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. У экспазіцыі прадстаўленыя 30 гравюр знакамітага фламандскага мастака.

■ **Суд Кастрычніцкага раёна Гродна прызнаў дырэктара ААТ «Гроднабурвод» вінаватым у атрыманні хабару. Ён прыгавораны да трох з паловай гадоў пазбаўлення волі ў выпраўленчай калоніі ўзмоцненага рэжыму з пазбаўленнем на тры гады права займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых функцый, і канфіскацыяй маёмасці. Хабар у памеры Br500 тыс. ён узяў пры заключэнні дагавора арэнды аднаго з памяшканняў таварыства на выгадных для хабарадаўцы ўмовах.**

■ Паліцыя невялікага кітайскага гарадка два дні чакала каля дома падазронага, якога збіралася арыштаваць, не жадаючы перашкаджаць яго вяселлю і першай шлюбнай ночы. Падазронага расшуквалі два гады за крадзеж у начным клубе. Нарэшце паступіла інфармацыя, што ён можа быць у сваёй новай дзяўчыны. Прыбыўшы на месца, праваахоўнікі выявілі, што сям'я дзяўчыны рыхтуецца да вяселля. Да ўсяго шлюбніца была цяжарная. Пасля заканчэння вяселля паліцэйскія вырашылі пачакаць да раніцы, каб не перашкаджаць маладым. І толькі раніцай яны арыштавалі жаніха, які яшчэ спаў. На словах жонкі, яна не ведала, што суджаны знаходзіцца ў вышуку. «Цяпер ужо позна чуць гэтую навіну», — сказала яна.

■ **Гродзенскія праваахоўнікі ўзбудзілі крымінальную справу ў дачыненні да двух 20-гадовых хлопцаў, якія спрабавалі ўгнаць аўтамабілі. На працягу адной ночы яны зрабілі восем спроб угнаць асабістыя аўтамабілі грамадзян. Яны разбівалі шкло, спрабавалі пранікнуць у салон і шляхам злучэння правадоў завесці рухавік. Завесці ўдалося толькі адзін «Масквіч», але, праехаўшы на ім некалькі метраў, няўдалыя ўгоншчыкі ўрэзаліся ў дрэва. На спробе завесці восьмую машыну іх затрымаў нарад «Аховы».**

■ Брэсцкім міжгарнізонным ваенным судом за крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі асуджаны былыя ваенна-служачыя органаў памежнай службы — два падпалкоўнікі запасу і маёр запасу. Кожнаму з іх назначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 3 гады ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. У красавіку 2006 года яны ўкралі партыю мабільных тэлефонаў, што падлягала звароту ў даход дзяржавы, на суму звыш Br14 млн.

■ **Інспектар ГТК затрыманы за незаконную лоўлю рыбы з прымяненнем выбуховых рэчываў у Бярэзінскім раёне. Аб гэтым паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Работнікам Бярэзінскай прыродаахоўнай міжрайінспекцыі з Бярэзінскага РАУС паступіла паведамленне аб незаконнай здабычы рыбы невядомымі асобамі на рацэ Бярэзіна з выкарыстаннем выбуховых рэчываў. Дзяржінспектары сумесна з супрацоўнікамі міліцыі выехалі на месца, сустрэліся са сведкамі, пачалі збор загінулай рыбы і афармленне матэрыялаў. У гэты час пад'ехаў легкавы аўтамабіль, за рулём якога быў інспектар ГТК у стане алкагольнага ап'янення. У апошнім сведкі пазналі аднаго з парушальнікаў. Пры аглядзе аўтамабіля ў багажніку была знойдзена мокрая гумавая лодка, падхватнік і свежая рыба. Пры аглядзе дома бацькоў парушальніка, у якіх ён знаходзіўся на адпачынку ў час водпуску, знойдзены і канфіскаваны асобіны розных відаў рыбаў з пашкоджаннямі, падобнымі на пашкоджанні ад выбуху. Паводле ацэнак спецыялістаў, прыродным рэсурсам нанесены ўрон у асабліва буйным памеры — каля 120 базавых велічынь.**

Поўны абзац

■ Шасцітонны танк выкарыстоўвае нямецкая сям'я з горада Нойаншпах для паездак па пакупкі і выездаў на прагулку, перадаюць інфармагенцтвы. Лёгкі танк на колавым ходзе абсталяваны 30-міліметровай нерабочай гарматай, пакрыты ахоўнымі пласцінамі таўшчынёй амаль у 8 см і прыводзіцца ў рух 4,2-літровым рухавіком у 200 конскіх сілаў. «Мы карыстаемся танкам для паездак па магазінах і прагулак», — гаворыць галава сямейства. Дарэчы, на прагулку ён бярэ і свайго 2-гадовага сына Пауля — спецыяльна для яго ў танку ўстаноўлена дзіцячае сядзенне. Сямейства вельмі задаволена сваім транспартным сродкам. Аднак танк не вельмі зручна паркаваць. Сур'ёзным недахопам браніраванага транспарту з'яўляецца і вялікі расход паліва — 50 літраў на 100 км, але, як кажа шчаслівы ўладальнік танка, гэта таго каштуе.

■ **Брытанка Лінда Ліс прызналася, што за апошнія чатыры месяцы тройчы спрабавала атруціць свайго мужа. 45-гадовая Ліс расказала, што яе муж, які служыць у Каралеўскіх ВПС інжынерам, вырашыў расстацца з ёй пасля 23 гадоў сумеснага жыцця. Пасля гэтага падчас вячэры ў рэстаране яна падсыпала істотную дозу транквілізатараў у яго талерку, патлумачыўшы афіцыянту, што хоча пакласці ў ежу заручальны пярсцёнак як знак кахання і вернасці. Муж, аднак, хутка зразумеў, што атруціўся. Гэта і выратавала яму жыццё, але не спыніла Лінду. Хутка яна паўтарыла спробу: падсыпала атруты ў кітайскую ежу, а затым — у напой. Зараз яна адпушчана пад заклад да суда, які адбудзецца ў кастрычніку. Як пракаментаваў следчы, гэта сапраўднае злачынства страсці.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Навіны сталіцы

ГАЗОНА-КАСІЛЬШЧЫКІ, АЎ!

У штаце УП «Зелянбуд Савецкага раёна» налічваецца ўсяго 15 касцоў. Сёлета на сезонную работу па скашванні травы прадпрыемства прыцягнула яшчэ 7 студэнтаў.

«Мы абслугоўваем 400 гектараў зялёных зонаў, — паведаміў галоўны інжынер УП «Зелянбуд Савецкага раёна» Дзмітрый Гарыльскі. — Каб своечасова скошваць раслінны дыван на ўсёй замацаванай тэрыторыі, неабходна ўдвая больш газонакасільшчыкаў — 65 чалавек. Таму прыходзіцца працаваць звышурочна, у тым ліку і па выхадных днях». Дарэчы, нормы выпрацоўкі на аднаго рабочага такія: з выкарыстаннем трымера за дзень трэба скасіць 35 сотак, з выкарыстаннем моташлака — 65.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ.

ХВОРЫМ НА ТУБЕРКУЛЁЗ — ХАРЧОВЫЯ НАБОРЫ

Як паведаміў галоўны пазаштатны фтызіятр Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Мікалай Куцан, цяпер харчовыя наборы атрымліваюць амаль 100 хворых, якія стаяць на медыцынскім абслугоўванні ў другім процітуберкулёзным дыспансэры. Акрамя прадукцыі, якая забяспечваюцца талонамі на бясплатнае харчаванне ў сталовых, сучасныя медыцынскімі процітуберкулёзнымі прэпаратамі. Дарэчы, гэтыя людзі — удзельнікі праекта, які фінансуецца Глабальным фондам па барацьбе са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй. Да канца гэтага года ў дадзены праект будуць уключаны і хворыя на туберкулёз, якія знаходзяцца пад медыцынскім наглядам спецыялістаў першага процітуберкулёзнага дыспансэра.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА.

АЎТАМАШЫНЫ З ТАНІРАВАНЫМ ШКЛОМ БУДУЦЬ ПАД УВАГАЙ СУПРАЦОЎНІКАЎ ДАІ

Супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі з 4 па 14 жніўня правядуць у Мінску спецмерапрыемствы па выяўленні транспартных сродкаў з зацемненым шклом. Як паведаміў начальнік упраўлення ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Дзмітрый Карзюк, пакаранне чакае вадзіцеляў, у чыіх аўтамабілях пярэдняе бакавое шкло мае святлопрапускную здольнасць менш за 70 працэнтаў, а задняе шкло і задняе бакавое шкло — менш за 60 працэнтаў. Увага таксама будзе звярнута на шторкі і плёначныя пакрыцці, якія абмяжоўваюць агляд і пагаршаюць празрыстасць шкла. За гэтае парушэнне правілаў прадугледжаны штраф у памеры да 2 базавых велічынь.

Ігар ГОЛАД, «Мінск—Навіны».

Ала Пугачова параіла Дзядзьку Ваню не перабіраць меру з вушанкай

Гэта было вельмі нечакана, і ў Івана Вабішчэвіча падкасіліся ногі, калі ён пачуў на цырымоніі закрыцця сёмага конкурсу маладых выканаўцаў папулярнай музыкі, што ўладальнікам прыза «Залатая зорка Алы» стаў ён.

Пасля ў прыватнай кароткай гутарцы Іван падзякаваў прымадонне і папрасіў парады, што рабіць з вобразам вясковага душы-хлопца далей. «Мегазорка расійскай эстрады адказала, што ўсё ў мяне добра, што я гну сваю лінію. І, магчыма, гэта было нефарматна для «Новай хвалі», але ўдала. Паколькі з вушанкай я ўжо запомніўся, з ёй больш перабіраць меру не варта. Ала Барысаўна пажартавала: «Вось табе крыху грошай — купі сабе нармальныя рэчы», — расказаў пра сустрэчу артыст.

Са сваім новым сцэнічным імем Іван Вабішчэвіч не мае намеру расставацца. Пасля вяртання дамоў і некаторага адпачынку выканаўца плануе арганізаваць канцэрт, у якім возьмуць удзел гурт «Ван Хельсінг» і мужчынскі балет «Кендзі-мэн». «Назавём праграму, напрыклад, «Дзядзька Ваня і сябры»».

На кінастудыі «Беларусьфільм» пачаліся здымкі фільма «Снайпер»

На нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» пачаліся здымкі 4-серыйнага тэлевізійнага мастацкага фільма «Снайпер». Як паведаміла прэс-сакратар кінастудыі Алена Мельнікава, гэта сумесны праект «Беларусьфільма», Белтэлерадыёкампаніі і кампаніі «Цэнтрал Партнёршып» (Расія). Аўтар сцэнарыя — Глеб Шпрыгаў, здымае фільм заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі рэжысёр Аляксандр Яфрэмаў.

Паводле слоў Алены Мельнікавай, акцёрскі ансамбль фільма атрымаўся сапраўды інтэрнацыянальным — Дзмітрый Пяўцоў, Марыя Міронава, Аліна Сяргеева (Расія), Ганна Хітрык, Барыс Гяргалаў, Аляксандр Яфрэмаў, Павел Харланчук (Беларусь); Павел Дэлонг (Польшча), Паўль Асбек (Германія), Владас Багданас (Літва). Карціна абяцае атрымацца дынамічнай, з поўным наборам трукаў і відовішчных сцэн.

Вольга БЕРАСНЕВА, «Мінск—Навіны».

ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ

Алена ДЗЕВОЙНА

РУБРЫКУ ВЯДЗЕ

КВАТЭРА Ў СПАДЧЫНУ

У газеце ўжо неаднаразова пісалі на тэму спадчыны, але я ўсё ж вымушана звярнуцца да вас па тлумачэнне. Сітуацыя такая. Спачыла гаспадыня прыватызаваную кватэры. Засталася праездная дачка, якая жыве асобна, і родная сястра гаспадыні, пенсіянерка, якая таксама жыве асобна. Завяшчання няма. У прыватызацыі кватэры акрамя гаспадыні ніхто не ўдзельнічаў. Як павінна размеркавацца спадчына?

Марыя Сымонаўна, *г. Гомель*

Згодна з Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь (артыкул 1032), атрыманне маёмасці ў спадчыну ажыццяўляецца па завяшчанні і па законе. Атрыманне спадчыны па законе адбываецца, калі завяшчанне адсутнічае або вызначае лёс не ўсёй спадчыны, а таксама ў іншых выпадках, устаноўленых Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

Калі кватэра прыватызаваная і аформлена на спачылую на праве ўласнасці, яна ўваходзіць у склад спадчыннай маёмасці (артыкул 1033 ГК) і можа быць атрымана ў спадчыну незалежна ад месца пражывання спадчынніка і наяўнасці ў яго сваёй такой жа маёмасці.

Як устаноўлена пунктам 1 артыкула 1056 ГК, спадчыннікі па законе кожнай наступнай чаргі набываюць права на атрыманне спадчыны ў выпадку адсутнасці спадчыннікаў папярэдняй чаргі, устанаўлення іх ад спадчыны, неприняцця імі спадчыны або адмовы ад яе.

Такім чынам, паколькі ў спачылай ёсць дачка, якая адносіцца да спадчыннікаў па закону першай чаргі, да атрымання спадчыны будзе прызвана толькі яна.

Родная сястра спачылай — спадчынніца па закону другой чаргі і магла б быць прызвана да атрымання спадчыны толькі ў выпадку адсутнасці спадчыннікаў першай чаргі. Правіла аб абавязковай долі ў спадчыне ў апісанай вамі сітуацыі таксама не можа быць прыменена да роднай сястры спачылай, паколькі гэта правіла распаўсюджваецца толькі на выпадкі, калі маецца завяшчанне, і толькі на няпоўнагадовых ці непрацаздольных дзяцей спадчынніка, а таксама на непрацаздольных мужа або жонку і бацькоў спачылага.

Больш падрабязна пытанні спадчыннасці, якія засталіся вам незразумелымі, вы можаце высветліць у натарыуса па месцы апошняга жыхарства спачылай.

На варце закона

ВЫСОКІЯ, АЛЕ ЗЛАЧЫННЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

У Магілёўскай вобласці расце колькасць злачынстваў, учыненых з выкарыстаннем камп'ютарных тэхналогій і электронных сродкаў доступу.

За сёлетнія паўгода іх колькасць павялічылася амаль утрая. Асноўная частка з больш чым 130 «высокатэхналагічных» злачынстваў — крадзяжы грошай з дапамогай банкаўскіх пластыкавых картак. У Бабруйску сёлета раскрыты дзве злачынныя групы, на рахунку якіх больш за 40 крадзяжоў з грашовых рахункаў грамадзян, у тым ліку і з дапамогай падробленых картак.

— Такія злачынствы складана раскрываць, лепей іх папярэджваць, — пракаментаваў начальнік УУС Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр Канавалаў. — У нашай вобласці банкаўскія пластыкавыя карткі маюць вырокае выкарыстанне, людзі іх і самі досыць часта губляюць і пакідаюць у банкаматах. Трэба быць пільнымі, аператыўна звяртацца і паведамляць аб праблемах. У тым ліку пра такія, калі картачка затрымалася на нейкі час у банкамаце — тут верагодна, што вашы даныя могуць счытаць і выкрасці грошы. Самыя даступныя ў такіх сітуацыях пенсіянеры, якія складаюць на картцы свае грошы, як за савецкім часам на ашчадныя кніжкі, і захоўваюць там значныя сумы.

Адзін з выпадкаў крадзяжоў сродкаў з банкаўскіх картак датычыцца супрацоўніка праваахоўных органаў. Міліцыянер аховы адкаў з банкаў здымаў сумы з картак, якія прызначаліся для атрымлівання крэдытаў. Гаварыць, грошы яму былі патрэбныя для гульні ў казіно.

Што датычыцца выкарыстання злачынцамі высокіх тэхналогій, то іх дзейнасць накіравана не толькі на банкаўскія карткі. Аляксандр Канавалаў расказаў пра нядаўні выпадак: мужчына ўвечары паставіў у гараж свой аўтамабіль «Аўдзі-6» і быў спакойны за яго захаванасць, бо машына абсталяваная сучаснымі абарончымі сігналізацыямі. Раніцай дарагі аўтамабіль знік. Відаць, зладзеі з дапамогай электроннага сродку доступу счыталі неабходную інфармацыю, адчынілі машыну і завялі рухавік. Цяпер «Аўдзі» шукае міліцыя.

Ілона ІВАНОВА.

Актуальна

Уладзімір ЖЭРАЛО:

УСЕ АХВОТНІКІ АДПАЧЫВАЦЬ ЗА МЯЖОЙ БУДУЦЬ ЗАБЯСПЕЧАНЫЯ БІЛЕТАМІ

Першая нядзеля жніўня — прафесійнае свята чыгуначнікаў. З гэтай нагоды была арганізавана прэс-канферэнцыя з удзелам галоўнага кіраўніцтва чыгункі. На размову з журналістамі прыйшоў і начальнік Беларускай чыгункі Уладзімір Жэрало.

— Чыгунка — гэта жыццё. Так, у нас ёсць шэраг праблем, але ўсе яны вырашальныя. Сёння ў нас існуе праблема недастатковасці грузавога саставу для арганізацыі перавозак, — кажа Уладзімір Жэрало.

Адзін вагон каштуе каля 96 тысяч долараў. А іх у год чыгунка закупляе больш за тысячу. Уявіце, якія грошы выдаткоўваюцца на гэта. Кіраўніцтва чыгункі бачыць вырашэнне праблемы шляхам закупкі вагонаў айчыннай вытворчасці. Дарэчы, сёння беларускія вагона-рамонтныя заводы ўжо могуць прапанаваць свае паслугі, але не ў тых аб'ёмах, якія патрэбныя чыгунцы. Але ўжо распрацоўваюцца праекты пашырэння вытворчасці.

— Летась мы закупілі толькі каля 20 грузавых вагонаў, якія былі сабраныя на тэрыторыі нашай краіны. А сёлета ўжо набылі 45. Прайшоў той час, калі пад плотам сталі нікому не патрэбныя вагоны, — кажа Уладзімір Жэрало.

Гэта не адзіная праблема Беларускай чыгункі, ёсць і іншыя. Ні для каго не сакрэт, што пасажырскія перавозкі не пакрываюць затраты. Так, летась чыгунка не дабрала па грузавых і пасажырскіх перавозках па краіне каля 470 млрд рублёў. Гэтая сума магла б пайсці на інвестыцыі асноўнага капіталу, які ў гэтым годзе складае больш за Br700 млрд. Як адзначыў Уладзімір Жэрало, сённяшніх інвестыцый могуць толькі дазволіць забяспечыць утрыманне таго, што ёсць. А вось калі да гэтай сумы дадаць яшчэ і тыя грошы, якія не дабралі з грузавых і пасажырскіх перавозак па краіне, тады інвестыцый хапіла б цалкам.

— Галоўная задача для Беларускай чыгункі — гэта забеспячэнне эканомікі краіны грузавымі і пасажырскімі перавозкамі. Чыгунка не павінна быць тормазам для развіцця эканомікі. Магу сказаць, што сёння чыгунка працуе ў нармальным і ўстойлівым рэжыме, — кажа Уладзімір Жэрало.

Не маглі не задаць начальніку Беларускай чыгункі і пытанне наконт выезду за тэрыторыю краіны ў самы пік па асноўных накірунках. «Усе ахвотнікі адпачываць за мяжой будуць забяспечаныя білетамі. Мы сочым за тым, як прадаюцца білеты. Калі ахвотнікаў кудысьці паехаць шмат, а месцаў ужо няма, тады прымаем рашэнне прычапіць да асноўнага саставу яшчэ некалькі вагонаў. Білетаў усім хопіць, яшчэ ніхто не скардзіўся на іх адсутнасць», — запэўніў Уладзімір Ільіч. Начальнік пасажырскай службы Аля

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ СХОДЗЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 28 мая 2008 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 20 чэрвеня 2008 года

Гэты Закон на аснове Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь вызначае прававы статус, прынцыпы, змест, парадак арганізацыі і дзейнасці Парламента — Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Парламент — Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь

Парламент — Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь (далей — Нацыянальны сход) з'яўляецца прадстаўнічым і заканадаўчым органам Рэспублікі Беларусь.

Нацыянальны сход складаецца з дзвюх палат — Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі.

Артыкул 2. Прынцыпы дзейнасці Нацыянальнага сходу

Дзейнасць Нацыянальнага сходу грунтуецца на прынцыпах:

дэмакратычнасці;

галоснасці;

падзелу дзяржаўнай улады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую;

вяршэнства права і законнасці;

прыярытэту агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права;

роўнасці грамадзян перад законам, павагі іх правоў і законных інтарэсаў;

свабоднага абмеркавання і прыняцця рашэнняў;

удзелу грамадзян у вырашэнні і абмеркаванні пытанняў дзяржаўнага жыцця.

Артыкул 3. Склад палат Нацыянальнага сходу

Склад Палаты прадстаўнікоў — 110 дэпутатаў. Абранне дэпутатаў Платы прадстаўнікоў ажыццяўляецца на падставе ўсеагульнага, свабоднага, роўнага, прамога выбарчага права пры тайным галасаванні ў парадку, устаноўленым Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і іншымі законамі Рэспублікі Беларусь.

Савет Рэспублікі з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Ад кожнай вобласці і горада Мінска тайным галасаванні выбіраюцца на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню кожнай вобласці і горада Мінска па восем членаў Савета Рэспублікі. Выбары праводзяцца ў парадку, устаноўленым Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і іншымі законамі Рэспублікі Беларусь. Восем членаў Савета Рэспублікі назначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 4. Тэрмін паўнамоцтваў Нацыянальнага сходу

Тэрмін паўнамоцтваў Нацыянальнага сходу — чатыры гады. Паўнамоцтвы Нацыянальнага сходу могуць быць прадоўжаны на падставе закона толькі ў выпадку вайны.

Паўнамоцтвы палат Нацыянальнага сходу пачынаюцца з дня першага пасяджэння зноў выбраных Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі і заканчваюцца ў дзень адкрыцця першага пасяджэння Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі новага склікання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных артыкуламі 5 гэтага Закона.

Артыкул 5. Датэрміновае спыненне паўнамоцтваў палат Нацыянальнага сходу

Паўнамоцтвы Палаты прадстаўнікоў могуць быць спынены датэрмінова ў выпадку:

адмовы ў даверы Ураду Рэспублікі Беларусь;

выказванне вотуму недаверу Ураду Рэспублікі Беларусь;

двухразовай адмовы ў дачы згоды на назначэнне Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь;

сістэматычнага (больш за два разы) або грубага парушэння Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь — на падставе заключэння Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

спынення паўнамоцтваў Савета Рэспублікі.

Паўнамоцтвы Савета Рэспублікі могуць быць спынены датэрмінова ў выпадку:

сістэматычнага (больш за два разы) або грубага парушэння Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь — на падставе заключэння Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

спынення паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў.

Рашэнні па пытаннях датэрміновага спынення паўнамоцтваў палат Нацыянальнага сходу прымае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь не пазней чым у двухмесячны тэрмін пасля афіцыйных кансультацый са старшынямі палат Нацыянальнага сходу.

Палаты Нацыянальнага сходу не могуць быць распушчаны:

у перыяд надзвычайнага або ваеннага становішча;

у апошнія шэсць месяцаў паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

у перыяд вырашэння палатамі Нацыянальнага сходу пытання аб датэрміновым вызваленні ад пасады або зняцця з пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

на працягу года з дня першага пасяджэння кожнай з палат Нацыянальнага сходу.

Артыкул 6. Кампетэнцыя Нацыянальнага сходу

Кампетэнцыя Нацыянальнага сходу рэалізуецца праз ажыццяўленне прадстаўнічых, заканадаўчых і іншых паўнамоцтваў палат Нацыянальнага сходу, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Палаты Нацыянальнага сходу ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы ў формах і межах, устаноўленых Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і гэтым Законам.

Палаты Нацыянальнага сходу пры ўзаемадзеянні з іншымі дзяржаўнымі органамі, органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, іншымі арганізацыямі самастойныя ў межах сваіх паўнамоцтваў.

Артыкул 7. Рашэнні палат Нацыянальнага сходу

Палата прадстаўнікоў прымае рашэнні ў форме законаў і пастаноў па пытаннях і ў парадку, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і Рэгламентам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

Пастановы Палаты прадстаўнікоў прымаюцца па пытаннях распарадчага і кантрольнага характару.

Савет Рэспублікі прымае рашэнні ў форме пастаноў па пытаннях і ў парадку, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і Рэгламентам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу.

Рашэнні палат Нацыянальнага сходу лічацца прынятымі пры ўмове, што за іх прагаласавала большасць ад поўнага складу палат Нацыянальнага сходу, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, часткамі пятай — сёмай гэтага артыкула.

Большасцю не менш чым дзве трэці галасоў ад поўнага складу кожнай з палат Нацыянальнага сходу прымаюцца:

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь;

законы аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь;

законы аб увядзенні ў дзеянне законаў аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь;

законы аб тлумачэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

законы аб асноўных накірунках унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, аб ваеннай дактрыне Рэспублікі Беларусь (праграмныя законы);

законы, вернутыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь са сваімі пярэчаннямі для паўторнага разгляду і галасавання, у выпадку пераадолення гэтых пярэчанняў;

законы аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у законы, асобныя палажэнні якога вернуты Прэзідэнтам са сваімі пярэчаннямі для паўторнага разгляду і галасавання, у выпадку пераадолення гэтых пярэчанняў.

Палата прадстаўнікоў па патрабаванні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні — Урада Рэспублікі Беларусь прымае большасцю не менш чым дзве трэці галасоў ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў законы, па якіх пагаджальнымі камісіямі, створанымі палатамі Нацыянальнага сходу, не прыняты ўзгодненыя тэксты праектаў законаў.

Большасцю не менш чым дзве трэці галасоў ад поўнага складу кожнай з палат Нацыянальнага сходу прымаюцца таксама рашэнні:

аб датэрміновым вызваленні ад пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

аб зняцці з пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

аб адмене часовых дэкрэтаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія маюць сілу закона.

Артыкул 8. Формы дзейнасці палат Нацыянальнага сходу

Работа Палаты прадстаўнікоў ажыццяўляецца ў форме пасяджэнняў, сумесных пасяджэнняў з Саветам Рэспублікі, парламенцкіх слуханняў, дзейнасці пастаянных і часовых камісій, іншых органаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутацкіх груп, дэпутатаў у Палаце прадстаўнікоў, выбарчых акругах, а таксама ў іншых формах у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Работа Савета Рэспублікі ажыццяўляецца ў форме пасяджэнняў, сумесных пасяджэнняў з Палатай прадстаўнікоў, парламенцкіх слуханняў, дзейнасці пастаянных і часовых камісій, іншых органаў Савета Рэспублікі, членаў Савета Рэспублікі, а таксама ў іншых формах у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 9. Парадак і формы ўдзелу палат Нацыянальнага сходу ў міжнародным супрацоўніцтве

Палаты Нацыянальнага сходу ажыццяўляюць супрацоўніцтва з парламентамі замежных дзяржаў, міжнароднымі парламенцкімі і іншымі міжнароднымі арганізацыямі ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь і рэгламентамі палат Нацыянальнага сходу.

Для ажыццяўлення кантактаў з парламентамі замежных дзяржаў і міжнароднымі парламенцкімі арганізацыямі палатамі Нацыянальнага сходу з ліку дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі ў парадку, устаноўленым рэгламентамі палат Нацыянальнага сходу, могуць фарміравацца пастаянна дзеючыя дэлегацыі і рабочыя групы.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі могуць таксама дэлегавацца адпаведна Палатай прадстаўнікоў (Саветам Палаты прадстаўнікоў), Саветам Рэспублікі (Прэзідыумам Савета Рэспублікі) у склад аб'яднаных пастаянна дзеючых дэлегацый і рабочых груп Нацыянальнага сходу, якія прадстаўляюць Нацыянальны сход пры ажыццяўленні двухбаковых або шматбаковых парламенцкіх кантактаў або ў міжнародных парламенцкіх арганізацыях.

Дзейнасць афіцыйных дэлегацый і рабочых груп Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі ў міжнародных парламенцкіх арганізацыях ажыццяўляецца згодна са статутамі (рэгламентамі) гэтых арганізацый у межах прадастаўленых гэтым дэлегацыям і групам паўнамоцтваў.

Артыкул 10. Заканадаўства аб дзейнасці палат Нацыянальнага сходу

Палаты Нацыянальнага сходу ў сваёй дзейнасці кіруюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, а таксама рэгламентамі палат Нацыянальнага сходу.

Статус дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі вызначаецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам Рэспублікі Беларусь ад 4 лістапада 1998 года «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 35, ст. 516), іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь. Асобныя пытанні іх дзейнасці могуць рэгулявацца рэгламентамі палат Нацыянальнага сходу, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 2
ПЫТАННІ АГУЛЬНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ ПАЛАТ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ

Артыкул 11. Заканадаўчыя паўнамоцтвы палат Нацыянальнага сходу

Палата прадстаўнікоў па прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь або па ініцыятыве не менш як 150 тысяч грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам, разглядае праекты законаў аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, аб тлумачэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Палата прадстаўнікоў па прапанове суб'ектаў права заканадаўчай ініцыятывы разглядае праекты іншых законаў Рэспублікі Беларусь.

Савет Рэспублікі адабрае або адхіляе прынятыя Палатай прадстаўнікоў праекты законаў.

У выпадках, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, рэгуляванне грамадскіх адносінаў ажыццяўляецца законамі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 12. Дэлегаванне заканадаўчых паўнамоцтваў Палатай прадстаўнікоў і Саветам Рэспублікі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь

Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі законам, прынятым большасцю галасоў ад поўнага складу палат Нацыянальнага сходу, па прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь могуць дэлегаваць яму заканадаўчыя паўнамоцтвы на выданне дэкрэтаў, якія маюць сілу закона. Гэты закон павінен вызначаць прадмет рэгулявання ўказаных дэкрэтаў у тэрмін паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на іх выданне.

Праект закона аб дэлегаванні Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь заканадаўчых паўнамоцтваў уносіцца ў Палату прадстаўнікоў Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і разглядаецца ў парадку, прадугледжаным Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і рэгламентамі палат Нацыянальнага сходу.

Не дапускаецца дэлегаванне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь паўнамоцтваў на выданне дэкрэтаў:

аб змяненні і (або) дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, аб тлумачэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у законы аб асноўных накірунках унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, аб ваеннай дактрыне Рэспублікі Беларусь (праграмныя законы);

аб бюджэце Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год і аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за папярэдні фінансавы год;

аб змяненні парадку выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага сходу;

якія абмяжоўваюць канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзян;

аб змяненні закона аб дэлегаванні заканадаўчых паўнамоцтваў Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь;

якія ўтрымліваюць нормы, што маюць зваротную сілу.

У перыяд тэрміну паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на выданне дэкрэта, які мае сілу закона, Нацыянальны сход не мае права прымаць законы па пытаннях, па якіх Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь дэлегаваны паўнамоцтвы на выданне дэкрэта.

Артыкул 13. Разгляд палатамі Нацыянальнага сходу часовых дэкрэтаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія маюць сілу закона

Часовы дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з абгрунтаваннем неабходнасці яго выдання ў трохдзённы тэрмін пасля яго падпісання прадстаўляецца для разгляду Палатай прадстаўнікоў, а пасля Саветам Рэспублікі.

Калі часовы дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прадстаўлены ў перыяд паміж сесіямі палат Нацыянальнага сходу, ён разглядаецца на чарговай (пазачарговай) сесіі палат Нацыянальнага сходу.

Разгляд палатамі Нацыянальнага сходу часовых дэкрэтаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым рэгламентамі палат Нацыянальнага сходу.

Не падлягаюць разгляду часовыя дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія страцілі сілу да моманту іх разгляду ў Нацыянальным сходзе.

Палаты Нацыянальнага сходу па выніках разгляду часовага дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які мае сілу закона, могуць прыняць рашэнне:

аб прыняцці часовага дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да ведама;

аб адмене часовага дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне аб прыняцці часовага дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да ведама лічыцца прынятым пры ўмове, што за яго прагаласавала большасць ад поўнага складу кожнай з палат Нацыянальнага сходу.

Рашэнне аб адмене часовага дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь лічыцца прынятым пры ўмове, што за яго прагаласавала не менш за дзве трэці ад поўнага складу кожнай з палат Нацыянальнага сходу.

Артыкул 14. Разгляд палатамі Нацыянальнага сходу пытанняў аб датэрміновым вызваленні ад пасады або зняцці з пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Палаты Нацыянальнага сходу могуць прыняць рашэнне аб датэрміновым вызваленні ад пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пры стойкай няздольнасці па стане здароўя ажыццяўляць абавязкі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне аб датэрміновым вызваленні ад пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прымаецца большасцю не менш за дзве трэці галасоў ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў і большасцю не менш за дзве трэці галасоў ад поўнага складу Савета Рэспублікі на аснове заключэння спецыяльна створанай палатамі Нацыянальнага сходу камісіі.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь можа быць зняты з пасады ў сувязі з учыненнем здрады дзяржаве або іншага асабліва цяжкага злачынства. Рашэнне аб вылучэнні абвінавачання супраць Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і яго расследаванні лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала большасць ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў па прапанове не менш за адну трэць яе дэпутатаў.

На падставе рашэння Палаты прадстаўнікоў, указанага ў частцы трэцяй гэтага артыкула, Савет Рэспублікі арганізуе расследаванне вылучанага абвінавачання.

Аб даце і часе пасяджэння Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў па разглядзе пытання аб зняцці з пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь паведамляецца Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь, Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне аб зняцці з пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сувязі з учыненнем здрады дзяржаве або іншага асабліва цяжкага злачынства лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала не менш за дзве трэці ад поўнага складу Савета Рэспублікі і не менш за дзве трэці ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў.

Непрыняцце Саветам Рэспублікі і Палатай прадстаўнікоў рашэння аб зняцці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з пасады на працягу месяца з дня вылучэння абвінавачання азначае адхіленне абвінавачання.

Прапанова аб зняцці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з пасады не можа ініцыявацца ў перыяд разгляду ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь пытання аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў палат Нацыянальнага сходу.

(Працяг у наступным нумары.)

Пра гэта вы не ведалі...

Як на Беларусі шукалі камяні на будаўніцтва маўзалея Леніна

У 1929 годзе пры будаўніцтве ў Маскве маўзалея У.І. Леніна было прынята рашэнне: калоны, якія падтрымліваюць верхнюю вянчаючую пліту, павінны быць выкананы з камянёў кожнай саюзнай рэспублікі.

19 жніўня Савет Народных Камісараў Беларускай ССР атрымаў з Масквы пісьмо-тэлеграму аб тэрміновай адпраўцы для будаўніцтва маўзалея дзвюх каменных калон чырванаватага колеру, памерам 150х40х40 см. Гэта пісьмо 23 жніўня накіроўваецца Беларускай Акадэміі Навук з рэзалюцыяй намесніка старшыні СНК БССР С.Б. Карпа: «Геалкаму Акадэміі Навук. Тэрмінова выслаць камень патрэбнага колеру».

І толькі 30 жніўня вучонымі Акадэміі быў падрыхтаваны адказ, што ў Беларусі няма такіх камянёў, якія б маглі адпавядаць запатрабаванням будаўнікоў. Пры гэтым напісаны адказ такой акадэмічнай мовай, што старшыня Саўнаркама БССР М.М. Галадзед прама на пісьме зрабіў наступны запіс:

«Раз'ясніць падпісаўшым гэту адносіну, што Саўнаркам не вучнёўская аўдыторыя для неўразумелых лекцый аб «фено-скандыі і эратычных валунах», а такая ўстанова, даручэнні якой абавязковыя для выканання ўсімі ўстановамі, у тым ліку і Акадэміяй.

Лічу абсалютна недапушчальным такія бяздушныя адносіны з боку геалагічнага камітэта да выканання такой пачэснай ролі, як удзел у пабудове маўзалея т. Леніна.

Запрасіць асабіста Прэзідэнта Акадэміі Навук т. Ігнатоўскага даць заключэнне аб тым, якія пароды могуць быць пасланы ў Маскву для будаўніцтва маўзалея і даручыць геалкаму выслаць іх...

Даручыць РСІ (Наркамат Рабоча-Сялянскай Інспекцыі. — (**Заўв. аўтара.**) расследаваць і прыцягнуць да адказнасці вінаватых у зацяжцы выканання даручэння Саўнаркама і чаму адказ ішоў з Акадэміі цэлы тыдзень».

Але сакратарыят СНК БССР у сваю чаргу накіраваў у Акадэмію пісьмо з вышэйпамянёнай рэзалюцыяй М.М. Галадзеда толькі 12 верасня, за што адказныя асобы сакратарыята пазней таксама будуць пакараны.

На наступны дзень ужо сам прэзідэнт Акадэміі У.І. Ігнатоўскі інфармуе СНК, што экспедыцыя для адшукання каменя накіравана па раёнах рэспублікі. А 14 верасня сакратарыят Акадэміі даведкай за подпісам В.Ю. Ластоўскага паведамляе, што камень патрэбных памераў, колеру і цвёрдасці знойдзены паблізу Мінска ў мясцовасці Дразды і што дзеля праверкі яго з боку будаўнічай вартасці акадэмія звярнулася да інжынера Шаркова, будаўніка Дома Ўрада.

А тым часам 17 верасня 1929 г. калегія Наркамата РСІ, расследуючы справу аб высыльцы ў Маскву камянёў, адзначала, што «заключэнне Акадэміі навук ад 30 жніўня 1929 г. мела характар адпіскі ў форме навуковага трактата аб гістарычных паходжаннях парод і адкладаў на паверхні і глыбіні зямлі Беларусі без канкрэтнага месца знаходжання і пароды каменя». Калегія прапанавала прыцягнуць часова выконваючага абавязкі прэзідэнта Акадэміі Казака, дырэктара геалагічнага інстытута Бліадуха, а таксама вінаватых з боку кіраўніцтва справамі СНК БССР да адміністрацыйнай адказнасці.

Здавалася б, меры прыняты, камяні знойдзены. Заставалася толькі распілаваць іх на патрэбныя памеры і адправіць у Маскву. Але дакументы архіва сведчаць аб тым, што на гэтым справа не скончылася.

Напэўна, тыя камяні, што былі знойдзены пад Мінскам, па сваёй вартасці не адпавядалі патрабаванням будаўнікоў маўзалея. 12 лістапада 1929 г. адбылося пасяджэнне Савета Народных Камісараў БССР з усё тым жа пытаннем: «Пра пошук і адпраўку ў Маскву калёных камянёў на пабудову маўзалея Леніна». Пастановай СНК даручалася Белдзяржбуду і Горнай групе ВСНГ БССР прыняць самы актыўны ўдзел у гэтай справе.

22 лістапада Вышэйшы Савет Народнай Гаспадаркі Рэспублікі інфармаваў СНК БССР аб тым, што «каля мястэчка Асвея Полацкай акругі знойдзены камяні адпаведных памераў і добрай якасці па цвёрдасці. Пасля іх апрацоўкі пяць штук будуць высланы ў Маскву».

Здаецца, на гэтым можна было б ставіць кропку. Але ў архіўнай справе знаходзім яшчэ адзін дакумент па гэтай доўгай гісторыі — пісьмо Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР ад 10 мая 1930 г. на імя старшыні СНК БССР: «Камиссией по постройке Мавзолея В.И. Ленина было поручено тресту «Минералсырье» войти в сношения с аппаратами Союзных Республик и получить от последних несколько камней для мавзолея В.И. Ленина. До настоящего времени не все выполнили заявку «Минералсырьё».

Прошу отдать распоряжение о добыче и доставке в Москву не позже 5 июня 2 камня от Вашей Республики».

СНК БССР тэрмінова праводзіць дазнанне і 24 мая 1930 г. старшыня Саўнаркама М.М. Галадзед падпісвае адказ сакратару ЦВК СССР А.С. Енукідзе: «Камень для мавзолея В.И. Ленина послан Белорусской Академией Наук еще 23 января 1930 г. (накладная № 378501) по адресу: Московская контора АО «Транспорт». Копии всех документов о высылке камней посланы в Постпредство БССР при Правительстве СССР с предложением срочно выяснить причины неполучения их «Минералсырьем».

